# Узброеныя Сілы: кампактныя, баяздольныя, гатовыя выканаць пастаўленую задачу

## Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам міністра абароны Віктара Хрэніна

**На парадку дня — два фундаментальных пытанні: задума і дэталі беларуска-расійскіх вучэнняў «Захад-2021» і вынікі пяцігадовага развіцця Узброеных Сіл краіны.**

Нядаўна кіраўнік дзяржавы даручыў абароннаму ведамству дапрацаваць разам з расіянамі асноўную задуму і нюансы правядзення стратэгічнага вучэння Узброеных Сіл дзвюх краін «Захад-2021». «Для мяне гэта сімвалічна, бо калі быў яшчэ маладым афіцэрам, мне давялося браць удзел у адным з такіх вучэнняў савецкіх Узброеных Сіл у Віцебскай вобласці па адпрацоўцы новых метадаў вядзення вайны, — расказаў Аляксандр Лукашэнка. — Калі я пазнаёміўся з задумай і нюансамі правядзення сёлетніх вучэнняў, убачыў, наколькі ўсё ж такі армія змянілася, наколькі мы прасунуліся наперад».

Беларускі лідар нагадаў, што даўно ўжо дамовіўся са сваім расійскім калегам аб правядзенні гэтых вучэнняў.

Другое пытанне ўчарашняй рабочай сустрэчы кіраўніка дзяржавы з міністрам абароны датычылася вынікаў будаўніцтва і развіцця Узброеных Сіл Беларусі за апошнія пяць гадоў.

«Перш за ўсё мы дамаўляліся аб прывядзенні колькасці нашай арміі да пэўнага ўзроўню, — сказаў Прэзідэнт. — Па-другое, мы павінны былі значна ўдасканаліць базу — нашы ваенныя гарадкі, гарнізоны і гэтак далей. Ну і трэцяе — узбраенне. Я ўвогуле ведаю сітуацыю, і някепска, па ўсіх трох кірунках, таму вы сканцэнтруйцеся на тым, на што нам трэба звярнуць увагу ў будучай пяцігодцы», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Віктар Хрэнін паведаміў, што аператыўная і баявая падрыхтоўка на тэрыторыі суседніх краін расце. «І не толькі на тэрыторыі краін Балтыі і Польшчы, але і на тэрыторыі Украіны, — дадаў ён. — Здавалася б, разрозненыя мерапрыемствы, якія праводзяцца па часе, месцы, але пытанні, што адпрацоўваюцца падчас вучэнняў, прыцягнутыя войскі, аб'екты інфраструктуры, якая ўдасканальваецца, — усё гэта сведчыць пра тое, што краіны Захаду працягваюць шукаць вырашэнне так званага пытання «беларускага выступу».

Адной з самых эфектыўных мер супрацьдзеяння ваеннай пагрозе, якая ўзрастае, з'яўляюцца мерапрыемствы стратэгічнага ўздзеяння, лічыць міністр абароны. Зыходзячы з гэтага беларускае і расійскае ваенныя ведамствы распрацавалі задуму вучэнняў «Захад-2021».

«У аснову задумы сумеснага стратэгічнага вучэння лёг адзін з магчымых варыянтаў эскалацыі ваенна-палітычнай абстаноўкі супраць умоўнай дзяржавы, — паведаміў журналістам па выніках дакладу Вярхоўнаму Галоўнакамандуючаму Віктар Хрэнін. — Вучэнні плануецца правесці цягам сямі сутак з 10 да 16 верасня. Па прапанове нашых расійскіх калег вучэнне пройдзе на тэрыторыі дзвюх краін, што дазволіць нам адпрацаваць пытанні выкарыстання рэгіянальнай групоўкі войскаў Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі і вядзення армейскіх аперацый».



Фота БелТА.

Падчас вучэння будзе таксама адпрацавана выкарыстанне сумесных штурмавых груп на ўрбанізаванай тэрыторыі, дадзена ацэнка новым і мадэрнізаваным узорам ваеннай спецыяльнай тэхнікі, якая паступіла на ўзбраенне, дадаў міністр.

«У нас з'явіцца магчымасць атрымаць баявы вопыт расійскіх калег, які павялічваецца і які потым можна выкарыстоўваць для ўдасканалення нашых Узброеных Сіл», — падсумаваў Віктар Хрэнін.

Ён адзначыў, што расійска-беларускія вучэнні будуць адлюстроўваць адзінства поглядаў абаронных ведамстваў абедзвюх краін на забеспячэнне ваеннай бяспекі Саюзнай дзяржавы.

На пытанне журналістаў пра магчымыя абвінавачанні з боку Захаду ў пагрозе, якую нібыта дэманструюць такія вучэнні, і пра тое, ці будуць запрошаныя заходнія назіральнікі, Віктар Хрэнін адказаў: «Яны (абвінавачанні. — **«Зв.»**) ужо з'явіліся, пэўнае іх (заходніх краін. — **«Зв.»**) абурэнне. Але мы, як у складзе Саюзнай дзяржавы і як самастойная дзяржава, маем права вызначаць, якія вучэнні, як і калі іх праводзіць. Вядома, мы запросім (назіральнікаў. — **«Зв.»**), няхай яны глядзяць — мы адкрытыя і гатовыя паказваць стан нашых Узброеных Сіл і ўзровень нашай падрыхтоўкі».

Адносна доўгатэрміновага і сярэднетэрміновага планаў па будаўніцтве і развіцці Узброеных Сіл Беларусі, яны выкананыя, паведаміў кіраўніку дзяржавы Віктар Хрэнін.

«У цэлым можна сказаць, што дзякуючы комплекснаму падыходу да выканання ўсіх мерапрыемстваў, якія былі закладзеныя ў планах, дасягнутыя пэўныя поспехі, — пракаментаваў ён потым журналістам. — Асноўныя кірункі, па якіх адбылося будаўніцтва і развіццё Узброеных Сіл, — арганізацыйна-штатныя мерапрыемствы (па дасягненні ўстаноўленай колькасці), утрыманне пэўнай долі новых і сучасных узораў узбраення ваеннай тэхнікі ад агульнай колькасці. Па ўсіх гэтых пытаннях мы пастаўленыя задачы выканалі».

За мінулую пяцігодку на ўзбраенне прынятыя больш за 450 узораў узбраення ваеннай спецыяльнай тэхнікі, капітальна адрамантаваны або мадэрнізаваныя больш за 250 узораў, што забяспечыла немалы ўзровень удзельнай вагі новай і сучаснай тэхнікі, удакладніў Віктар Хрэнін.

Ён нагадаў, што за гэты час былі пастаўленыя на ўзбраенне самалёты Су-30СМ, Як-130, верталёты Мі-8МТВ5, рэактыўная сістэма залпавага агню «Паланэз», зенітна-ракетны дывізіён Тор-М2, сучасныя сродкі сувязі, навігацыя, сродкі радыёэлектроннай разведкі, зброя, сродкі абароны для асабовага складу.

«На сёння Узброеныя Сілы кампактныя, баяздольныя і гатовыя выканаць пастаўленую задачу. У цэлым адпавядаюць усім сучасным патрабаванням, якія да іх прад'яўляюць кіраўнік дзяржавы і наш народ», — рэзюмаваў міністр.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

---

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Беларусы былі і будуць адным народам»

### Пра гэта Аляксандр Лукашэнка гаварыў на традыцыйным прыёме ў пачатку года

**Прыём ад імя Прэзідэнта прайшоў у суботу ў Нацыянальным выставачным цэнтры «БелЭкспа». Традыцыйна ён праводзіцца напярэдадні або пасля старога Новага года. На мерапрыемстве з рук кіраўніка дзяржавы атрымліваюць свае ўзнагароды дзеячы розных сфер, якія дасягнулі значных вынікаў.**

«Гэты год прымусіў нас паглядзець на свет і сваё месца ў ім шырока расплюшчанымі вачыма. З аднаго боку, 2020-ы надзеў на нас маскі, з іншага — зняў іх», — сказаў кіраўнік краіны ў сваім выступленні.

Ён адзначыў, што людзі лепш пазналі адзін аднаго — у кімсьці расчараваліся, а ў кімсьці знайшлі апору, убачылі беларусаў, якія ў востры гістарычны момант засталіся вернымі гонару і сумленню, што ў гэты прагматычны век асабліва каштоўна.

«Калі памятаеце, пару гадоў таму ў гэтай зале я сказаў, што ў 19-м і 20-м гадах нас будуць спрабаваць на зуб: вартыя мы ці не сваёй незалежнасці. Час праверыў нас і даў адказ: наогул вартыя, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — ***У 2020-м нам фактычна аб'явілі вайну. І развязана яна была не супраць Прэзідэнта, дзяржслужачых і сілавых структур, а супраць моцнай дзяржавы ў цэлым. Дзяржавы, якая, нягледзячы на сціплае месца на карце свету, можа дазволіць сабе праводзіць незалежную знешнюю і ўнутраную палітыку».***

Менавіта ў гэтым прычына, на думку Прэзідэнта, у выкліку нашай краіне. «Са слабай (краінай. — **«Зв.»**) разабраліся б і без вайны. Калі б мы былі вельмі моцныя, нам бы не прад'яўлялі такія прэтэнзіі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле яго слоў, суверэнітэт краіны немагчымы без моцнай улады (асабліва гэта важна ў час, калі сабраліся перагледзець Канстытуцыю), якую ўвасабляе сабой не адзін чалавек, а нацыя, гатовая згуртавацца, калі дзяржава пад ударам.

***«Мы выстаялі, таму што былі адзіныя ў імкненні захаваць мір і гістарычную праўду, свой уклад жыцця і менталітэт.*** Раскачаліся, праўда, не адразу, — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. — ***Таму абвешчаны Год народнага адзінства — гэта не столькі задача на будучыню, як неабвержны факт і наш адказ нядобразычліўцам: беларусы былі і будуць адным народам».***

Прэзідэнт заявіў, што беларусы прайшлі праз выпрабаванні, якія зламалі не адзін народ, але ўзялі свой лёс ва ўласныя рукі: ***«Мы прачнуліся. І гэта найлепшае, што магло з намі, беларусамі, адбыцца. Пакуль узялі свой лёс у рукі. Пагадзіцеся, наша родная Беларусь заслугоўвае, каб мы бераглі яе і шанавалі свой нацыянальны статус. Статус грамадзяніна моцнай і незалежнай краіны».***

**Марыя ДАДАЛКА.**

---

# Заслужаная нагода для нацыянальнага гонару

**Учора, 18 студзеня, Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ № 18 «Аб прысуджэнні Дзяржаўных прэмій Рэспублікі Беларусь 2020 года», у якім паведамляецца пра ўзнагароджанне беларускіх калійшчыкаў, анколагаў і скульптара**

Прэмія прысуджана генеральнаму дырэктару «Беларуськалія» Івану Галаватаму, намесніку галоўнага інжынера па горных работах — начальніку ўпраўлення горных работ Андрэю Пятроўскаму, намесніку галоўнага інжынера па перспектыўным развіцці — начальніку аддзела перспектыўнага развіцця Дзмітрыю Барбікаву, намесніку дырэктара па вытворчасці Салігорскага інстытута праблем рэсурсазберажэння з доследнай вытворчасцю Аляксандру Канапляніку, начальніку аддзела галоўнага канструктара — намесніку галоўнага канструктара Дзмітрыю Доўнару і начальніку аддзела вяемачных машын і комплексаў Вячаславу Міхаленю.

«У выніку выкананых аўтарамі даследаванняў і распрацовак створаныя і ўкаранёныя новыя тэхналогіі вядзення горных работ па здабычы калійных солей, інтэлектуальная сістэмы кіравання тэхналагічнымі працэсамі, асвоена вытворчасць сучаснай высокапрадукцыйнай імпартазамяшчальнай тэхнікі для горнай і хімічнай прамысловасці, — сказана ў каментарыі да Указа. — Выкарыстанне новых тэхналогій вымання калійных пластоў дазваляе здабываць з нетраў больш за 80 % запасаў калійных солей (рост на 20 %). Сёння такога паказчыка не дасягнуў ніводны калійны руднік у свеце (у Расіі, Германіі і Канадзе паказчык здабывання не перавышае 40 %). У Беларусі ўпершыню прыменена новая тэхналогія раскрыцця запасаў калійных солей з выхадам на прадукцыйны пласт менш чым за два гады (ужыванне стандартнай схемы займае да шасці гадоў), у выніку капітальныя выдаткі зніжаны ў дзевяць разоў».

Агульны эканамічны эфект ад работы склаў Br993 млн, створана больш за 700 новых рабочых месцаў для высокакваліфікаваных спецыялістаў, інфармуе сайт.

За цыкл работ «Новыя метады дыягностыкі і лячэння анкалагічных захворванняў у дарослых і дзяцей» прэміі ўдастоены дырэктар РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя Аляксандрава Сяргей Палякоў, яго намеснік па навуковай рабоце Сяргей Красны і намеснік па хірургіі Віктар Кахнюк, загадчык лабараторыі таракальнай анкапаталогіі Віктар Малькевіч, галоўны навуковы супрацоўнік РНПЦ дзіцячай анкалогіі, гематалогіі і імуналогіі Вольга Алейнікава і экс-кіраўнік РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі Алег Суконка.

У галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры прэмія прысуджана дацэнту кафедры скульптуры Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Канстанціну Касцючэнку за стварэнне манумента «Брама памяці» ў мемарыяле «Трасцянец».

«Праект «Брама памяці» ўносіць значны ўклад у фарміраванне агульнаеўрапейскай культуры памяці, а таксама ў прымірэнне і паглыбленне ўзаемаразумення паміж народамі. Бронзавая скульптурная кампазіцыя «Брама памяці» не мае аналагаў у сучасным беларускім мастацтве і з'яўляецца выдатнай прафесійнай творчай работай», — сказана ў каментарыі да Указа.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**